Шашкова К.Д., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лупашко И.Г.,
кандидат культурологии, доцент кафедры

# ВІРТУАЛЬНАЯ ЭКСКУРСІЯ ЯК СРОДАК ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Экскурсія (ад лац. excursio-паездка, вылазка) – калектыўная (прыватная) паездка або прагулка куды-небудзь з навукова-адукацыйнай або забаўляльнай мэтай [4].

Інавацыі ў экскурсійнай дзейнасці разумеюцца як новыя па тэматыцы і форме экскурсіі, анімацыйныя праграмы, інтэграваныя ў экскурсійныя маршруты, новыя падыходы да распрацоўкі і ўдасканалення экскурсій, новыя метадычныя прыёмы і тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца экскурсаводамі. Інавацыйнымі могуць быць як ўдасканаленыя класічныя, так і ўведзеныя ў практыку новыя экскурсіі і паслугі.

Паўсюдна ў свеце назіраецца з'ява «смартфанізацыі» і цыфравізацыі экскурсанта. Многія наведвальнікі аддаюць перавагу аўдыягідам, онлайн экскурсіям, замест аповеду жывога экскурсавода [2].

Онлайн экскурсія (віртуальная экскурсія) – гэта 3-х ці 2-х мерная прастора, размешчаная ў сетцы Інтэрнэт, якая дазваляе патэнцыйнаму наведвальніку атрымаць уяўленне аб якім-небудзь рэальным аб'екце. Створаная мадэль дазваляе ажыццяўляць перамяшчэнні па віртуальным аб'екце, кручэнне аб'екта, размяшчэнне інтэрактыўных элементаў. Такім чынам, карыстальнік, не выходзячы з дому і не прыкладаючы ніякіх намаганняў, можа ацаніць гэты прадукт [2].

Віртуальныя экскурсіі з’явіліся яшчэ ў 1994 годзе. Першым віртуальным турам стала азнаямленчая экскурсія музея «Замак Дадлі» ў

Англіі, якая складаецца з "прагулкі" па 3D-рэканструкцыі адноўленага выгляду замка ў 1550 годзе [1]. Абсталяванне для экскурсіі складалася з сістэмы лазернага дыска з кампутарным кіраваннем, распрацаваным брытанскім інжынерам Колінам Джонсанам. Адным з першых наведвальнікаў віртуальнага тура стала каралева Лізавета ІІ. Анлайн экскурсіі атрымалі асабліва шырокае распаўсюджванне ў 2019-2021 гадах, у сувязі з сусветнай пандэміяй, а да 2022 – трывала ўвайшлі ў турыстычную практыку.

Плюсы віртуальных экскурсій:

- даступнасць;
- магчымасць агляду ў любы час;
- магчымасць шматразовага "ўдзелу" ў экскурсіі і прагляду прыкладаемай інфармацыі;
- эфект прысутнасці.

Мінусы:

- немагчыма задаць пытанне ў рэжыме рэальнага часу;
- залежнасць ад стваральнікаў – немагчыма ўбачыць тое, што не ўключана ў экскурсію;
- абмежаванасць уражанняў.

Экскурсіі выкарыстоўваюцца для прыцягнення ўвагі да культурнай спадчыны, аднак пабываць на звычайнай экскурсіі могуць не ўсе. Асаблівую цікавасць онлайн экскурсіі ўяўляюць для такіх катэгорый патэнцыяльных турыстаў як людзі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і людзі з недахопам сродкаў [1].

Да 2022 года віртуальныя экскурсіі з’явіліся практычна ва ўсіх музеях свету: Музеі Орсе (Парыж, Францыя), Музеі Саламона Гугенхейма (Нью-Ёрк, ЗША), Луўры (Парыж, Францыя), Музеі мадам Цюсо (Лондан, Вялікабрытанія), Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Нацыянальным музеі Карэі (Сеул, Рэспубліка Карэя) і многіх іншых. Напрыклад, у музеі Ван

Гога (Амстэрдам, Нідэрланды) захоўваецца самая буйная калекцыя работ мастака (больш за 200 палотнаў), а таксама працы яго сучаснікаў – Поля Гагена, Жоржа Сера, Клода Манэ і іншых. Для азнаямлення з імі можна адправіцца ў віртуальны тур па музеі з Google [6].

Віртуальныя экскурсіі таксама прапаноўваюцца ў музеях і гісторыка-культурных комплексах Беларусі: Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна", мемарыяльныя комплексы "Брэсцкая крэпасць-герой", "Хатынь" і іншыя.

Прапаноўваюць онлайн вандроўкі і іншыя турыстычныя аб'екты. Напрыклад, яшчэ ў 2018 годзе ў Інтэрнэце з'явіўся відэагід па Белавежскай пушчы: на сайце ForestSpace.eu можна апынуцца ў некалькіх кропках найстарэйшага ў Еўропе леса і паслухаць аўдыёэкскурсіі пра незвычайныя месцы пушчы, напрыклад, пра камень-ахвярнік. Таксама на сайце ёсць архіўныя фотаздымкі, прывязаныя да канкрэтнай лакацыі ў лесе, дзе можна даведацца, як было раней і што на тым жа месцы адбываецца цяпер [3].

Віртуальная экскурсія па сутнасці – гэта мультымедыйная фотапанарама, у якую можна змясціць відэа, інфаграфіку, тэкст, спасылкі. Але назваць ўбачанае проста панарамай нельга, паколькі яна стварае эфекты прысутнасці і прагулкі. Назва "экскурсія" характарызуе яе магчымасці больш дакладна. Каб прыцягнуць і ўтрымаць увагу наведвальніка на сайце, неабходна пераадолець перагрузку ўвагі тэкставай і таблічнай інфармацыяй. Камунікацыя павінна быць яркай, прыкметнай. Неабходна як мага даўжэй утрымліваць увагу наведвальнікаў з дапамогай актыўнага ўзаемадзеяння з імі [5].

Акрамя экскурсій, сёння ў віртуальнай прасторы працуюць праекты па захаванні культурнай спадчыны. Адна з самых папулярных платформаў віртуальнай рэальнасці напрамую звязана з музеямі і аб'ектамі спадчыны. Timelooper – гэта дадатак для падарожжаў у часе, прызначаны для таго, каб даць людзям магчымасць цалкам пагрузіцца ў гістарычныя падзеі,

перажываючы мінулае ад першай асобы. TimeLooper заснаваны на мабільным месцазнаходжанні і пераносіць наведвальнікаў прама ў сэрца знакавых момантаў гісторыі з дапамогай відэаролікаў віртуальнай рэальнасці на 360°. Дадатак знаёміць наведвальнікаў з гісторыямі гэтых месцаў, узнаўляючы гістарычныя моманты з дапамогай візуальных рэстаўрацый архітэктурных збудаванняў, старадаўніх касцюмаў, гістарычных рэліквій і людзей мінулага [7].

YouTube пастаянна павялічвае сваю калекцыю культурнага VR-кантэнту, створаную на аснове спіса ЮНЕСКА. Сярод іншых ёсць матэрыялы, якія прадстаўляюць падзеі 1941 года ў Пэрл-Харбар. Размяшчаючы кантэнт на свой афіцыйны канал YouTube, часопіс TIME дазваляе гледачам пачуць пераказы апавяданняў ветэранаў, у той час як 360-градусныя візуальныя эфекты паказваюць разбурэнні, выкліканыя гэтым інцыдэнтам.

Кампанія аўстралійскага археолага Саймана Янга, Lithodomous VR, стварае захапляльныя віртуальныя аднаўленні культавых руін, такія як Храм Венеры і Рыма і Арэн-дэ-Лютэс, абодва размешчаны ў сталіцы Італіі, якія можна паглядзець з дапамогай гарнітур для смартфонаў.

Праект Open Heritage – супрацоўніцтва паміж Google і некамерцыйнай арганізацыяй CyArk. Віртуальная рэальнасць выкарыстоўваецца для публікацыі ў Інтэрнэце рэалістычных 3D-мадэляў 26 аб'ектаў спадчыны ў 18 краінах, сярод якіх часткі рымскага горада Пампеі, скальнае жыллё карэнных амерыканцаў у Меса-Вэрдэ на поўдні Каларада і 1000-гадовы храм Кукулькана ў горадзе майя Чычэн-Іца [7].

Тэхналогіі віртуальнай 3D-экскурсіі ўсё часцей выкарыстоўваюцца для дакументавання і захавання выяў гістарычных аб'ектаў, якім пагражае разбурэнне або доступ да якіх абмежаваны. Віртуальныя 3D-мадэлі, якія выкарыстоўваюць стандартныя фарматы файлаў, такія як фармат Object file

(.obj), можна захоўваць у лічбавых архівах для будучых акадэмічных даследаванняў.

Падсумоўваючы вынікі, адзначым, што віртуальныя экскурсіі маюць як перавагі, так і недахопы. Аднак, пры граматным іх выкарыстанні, могуць выступаць дзейсным сродкам папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Віртуальныя туры валодаюць эфектам прысутнасці, што дае гледачу рэальнае ўяўленне аб памяшканні ці мясцовасці. Сферычныя панарамы даюць поўную свабоду экскурсантам, якія могуць разглядаць менавіта тое, што ім цікава, без абмежаванняў па часе. Акрамя гэтага, сучасныя тэхналогіі з'яўляюцца перспектыўным спосабам дакументавання і захавання выяў гісторыка-культурных аб’ектаў і рэканструкцыі ўжо страчаных.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Амирханова, Г. Виртуальные экскурсии — эффект присутствия на месте события [Электронный рэсурс] / Г. Амирханова – Рэжым доступу: https://newreporter.org/2012/04/26/virtualnye-ekskursii-effekt-prisutstviya-na-meste-sobytiya/ . – Дата доступу: 15.02.2022

2. Инновационные технологии в экскурсионной работе [Электронный рэсурс]. – Рэжым доступу: https://archive.sendpul.se/4gsr5/. – Дата доступу: 16.02.2022

3. Государственное учреждение образования «Средняя школа №138 г.Минска» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sch138.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=22821 . – Дата доступа: 14.02.2022

4. Толковый словарь русского языка Ушакова. Экскурсия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://slovar.cc/rus/ushakov/469305.html . – Дата доступа: 03.03.2022

5. Чирский, Н.А. Инновации в экскурсионной деятельности [Электронный ресурс] / Н.А. Чирский – Режим доступа: https://rep.polessu.by/bitstream/123456789/9828/1/4.pdf .- дата доступу 15.02.2022. – Дата доступа: 07.03.2022
6. 41 лучший виртуальный музей мира, который необходимо посетить [Электронный ресурс].– Режим доступа: https://www.canva.com/ru_ru/obuchenie/virtualnye-ekskursii/ . – Дата доступа: 14.02.2022
7. What is a Virtual Tour [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://360virtualbusinesstours.com/360-virtual-business-tour-faqs/what-is-a-virtual-tour/ . – Дата доступа: 15.02.2022

Шелег Е.А., магистрант
дневной формы обучения
Научный руководитель – Мойсейчук С.Б.,
кандидат педагогических наук, доцент

## СОВРЕМЕННЫЕ ПОДХОДЫ К ОПРЕДЕЛЕНИЮ ПОНЯТИЯ ИНКЛЮЗИЯ

В современном мире, в работах исследователей все чаще встречается мысль о "многомерности" Человека и окружающего мира. Свидетельством этого явления становится сам факт существования многообразия различных социальных, этнических религиозных, философских, научных систем, что, в свою очередь, побуждает современных исследователей ко всестороннему изучению актуальных проблем инклюзии в современном обществе.

Тема инклюзии приобретает всё большую популярность в научных, педагогических, медицинских и творческих кругах, широко освящается и в